**Білет 7**

**Практычнае заданне.**

**Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у другой палове 1940-х–1980-ыя гг.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Якія галіны прамысловасці БССР аднаўляліся ў першую пасляваенную пяцігодку найбольш хуткімі тэмпамі?
2. Пацвердзіце цытатамі сцвярджэнне: «У другой палове 1960-х г. у рэспубліцы палепшылася забеспячэнне сельскай гаспадаркі тэхнікай».
3. Што такое экстэнсіўны шлях развіцця?
4. Ці можна лічыць правільным сцвярджэнне: «З другой паловы 1940-х гг. у БССР паступова фарміравалася індустрыяльнае грамадства, характэрнымі рысамі якога з'яўляюцца: спецыялізацыя вытворчасці, выкарыстанне ў вытворчасці дасягненняў навукі, урбанізацыя»? Пацвердзіце сваё меркаванне фактамі з прадстаўленых матэрыялаў.

**I. Тэмпы росту валавой прадукцыі прамысловасці БССР у 1945–1950 гг. (у % да 1940 г.)**

| Галіны прамысловасці | 1945 г. | 1950 г. |
|---|---|---|
| Вытворчасць электраэнергіі і цеплаэнергіі | 20 | 153 |
| Хімічная | 5 | 198 |
| Машынабудаванне і металаапрацоўка | 45 | 237 |
| Лясная і дрэваапрацоўчая | 23 | 89 |
| Лёгкая | 10 | 74 |
| Харчовая | 19 | 85 |

**II. Развіццё прамысловасці БССР у другой палове 1950-х – 1980-ыя гг.** *(па матэрыялах вучэбнага дапаможніка "Гісторыя Беларусі. 1917 г. – пачатак XXI ст. 9 клас")*

У другой палове 1950-х – 1980-ыя гады ў БССР першачарговая ўвага надавалася развіццю цяжкай прамысловасці.

У 1958 г. Беларускі аўтамабільны завод у Жодзіне пачаў выпуск першых самазвалаў БелАЗ. У 1960 г. упершыню ў СССР у Мінску на заводзе электронных вылічальных машын была выпушчана ЭВМ «Мінск 1». У 1962 г. пачаў выпускаць прадукцыю Мінскі завод халадзільнікаў. Быў пабудаваны шэраг новых прамысловых прадпрыемстваў, сярод якіх – Магілёўскі металургічны завод, Мінскі завод аўтаматычных ліній.

Адкрыццё вялікіх запасаў калійных солей у Салігорскім раёне дазволіла разгарнуць у рэспубліцы шырокамаштабную вытворчасць мінеральных угнаенняў. Былі пабудаваны першы і другі Салігорскія калійныя камбінаты, Гомельскі суперфасфатны і Гродзенскі азотнатукавы заводы.

Быў пабудаваны шэраг буйных нафтахімічных прадпрыемстваў. Сярод іх – нафтаперапрацоўчы завод і хімічны камбінат у Наваполацку, Светлагорскі завод

штучнага валакна. У 1965 г. выпуск прадукцыі хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці ў рэспубліцы павялічыўся ў параўнанні з 1950 г. у 27 разоў.

У 1970–1980-я гг. у БССР пачаўся выпуск прадукцыі на металургічным заводзе ў Жлобіне. Быў пабудаваны нафтаперапрацоўчы завод у Мазыры.

Другая палова 1960-х – першая палова 1980-х гг. характарызаваліся далейшым развіццём транспарту. Адбылася электрыфікацыя асноўнай чыгуначнай лініі Брэст – Масква. Была здадзена ў эксплуатацыю першая лінія Мінскага метрапалітэна.

Развіццё прамысловасці прывяло да павелічэння колькасці гарадскога насельніцтва. Большая частка моладзі з вёсак перасялялася ў гарады. Калі ў 1966 г. гарадскіх жыхароў налічвалася 3,3 млн чалавек (39% ад агульнай колькасці насельніцтва БССР), то ў 1985 г. — 6,2 млн (62 %). У Беларусі з’явіліся новыя добраўпарадкаваныя гарады: Салігорск. Наваполацк, Светлагорск.

У сярэдзіне 1980-х гг. БССР была адной з самых эканамічна развітых рэспублік СССР. Але развіццё эканомікі Беларусі адбывалася экстэнсіўным шляхам, г.зн. за кошт павелічэння колькасных паказчыкаў. Сярод іх – будаўніцтва новых прадпрыемстваў, павелічэнне колькасці работнікаў і аб’ёму затрачаных грошай з дзяржаўнага бюджэту. Пры гэтым істотна знізіліся якасныя паказчыкі, у прыватнасці, тэмпы росту прадукцыйнасці працы.

**III. З даклада П.М. Машэрава «Аб выніках кастрычніцкага (1968 г.) Пленума ЦК КПСС і задачах Кампартыі Беларусі па далейшым развіцці сельскай гаспадаркі»**

“Важнае значэнне для развіцця сельскай гаспадаркі ў 1960-я гг. мела інтэнсіўная механізацыя і электрыфікацыя. Значна павялічылася колькасць збожжаўборачных камбайнаў, грузавых аўтамабіляў. У выніку ўзрасла прадукцыйнасць працы, павялічылася колькасць выпушчанай прадукцыі. З мэтай асушэння забалочаных зямель і павелічэння пасяўных плошчаў шырокі размах набыла меліярацыя на Палессі.

За 1965–1967 гг. капіталаўкладанні ў сельскую гаспадарку склалі 1 млрд 155 млн руб. – на 45% больш, чым за папярэднія тры гады.

У мінулым годзе сельская гаспадарка рэспублікі атрымала больш, чым у 1962 г., трактароў – на 4916, збожжаўборачных камбайнаў – на 1235, грузавых аўтамабіляў – на 1964. Сярэднегадавы аб’ём валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі ў 1965–1967 гг. перавысіў на 31% сярэднегадавыя паказчыкі за апошнія тры гады…”